ские и психолого-педагогические аспекты : материалы III Междунар. науч.-практ. интернет-конф., Чита, 25–30 марта 2011 г. / Читинск. гос. ун-т. – Чита, 2011. – С. 126–127.

***Ю. Д. Царэвіч,***
*выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СВЯТОЧНЫЯ ПАРАТЭАТРАЛЬНЫЯ ДЗЕЙСТВЫ БЕЛАРУСІ ЯК ФОРМА АДЛЮСТРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараджэнне паратэатральных з’яў цесна звязана з відовішчнымі святочнымі дзеямі эпохі Сярэднявечча, якія часта ўяўлялі сабой тэатралізаванае прадстаўленне з мэтай здзіўлення ўдзельнікаў і гледачоў.

На тэрыторыі Беларусі ў часы Вялікага Княства Літоўскага паратэатральныя дзействы адыгрывалі значную ролю ў культурным жыцці грамадства, а таксама актыўна спрыялі развіццю гарадскіх святочных мерапрыемстваў. Нагодай для правядзення падобных відовішчаў служылі вартыя ўвагі падзеі: каранацыі, шлюбы, нараджэнне і хрэсьбіны дзяцей, прыём тытулаваных гасцей і г. д. Разгледзім некалькі традыцыйных відаў паратэатральных з’яў, што былі неад’емнай часткай гарадскога свята на Беларусі.

Яскравымі прыкладамі могуць служыць: *рыцарскія турніры*, якія ператварыліся ў паратэатральнае відовішчнае мастацтва і працягваюцца па сённяшні час; *тэатралізаванае паляванне* – відовішчная дзея, што насіла адначасова ваенна-прыкладны і забаўляльны характар; *«генеральныя попісы»* – гарадская відовішчная публічная з’ява як адна з форм падтрымкі ваеннай дысцыпліны ў мірны час у гараджан Беларусі ў XVI–XVIII стст.; *кірмашы* як комплекс тэатральных і паратэатральных дзействаў, якія праводзіліся ў Беларусі ў XIV–XX стст. у час штогодніх святочных таргоў; *пахавальныя цырымоніі.*

Адной з вядомых, шырока распаўсюджаных *рыцарскіх паратэатральных з’яў* на Беларусі ў XVIII ст. былі так званыя «конныя каруселі» – тэатралізаваныя касцюміраваныя коннаспартыўныя спаборніцтвы, што прыйшлі на змену рыцарскім турнірам у XVII–XVIII стст. і сталі папулярнымі пры вяліка-

княжацкіх еўрапейскіх дварах. У іх маглі прымаць удзел толькі прадстаўнікі шляхецтва, і не маглі ўдзельнічаць прадстаўнікі іншых саслоўяў.

Таксама да паратэатральных з'яў, якія насілі адначасова ваенна-прыкладны і забаўляльны характар, адносяцца *тэатралізаваныя паляванні* (XV–XVIII). Ваенная падрыхтоўка займала важнае месца ў жыцці шляхты і гараджан Вялікага Княства Літоўскага.

Пачатак тэатралізаванага палявання часам нагадваў карнавальнае шэсце. Паводле апісання Ю. І. Крашэўскага, выезд на паляванне Караля Станіслава Радзівіла («Пане Каханку») суправаджала некалькі тысяч пяхоты, уланы і конная шляхта, псарня, «звыш таго вазы з сеткамі, для чаго былі асобныя мулы ў вельмі прыгожай, са званочкамі, вупражы; з палаткамі ішлі больш дзесяці вярблюдаў» [4, с. 202]. Паляванні, якія ладзіў для гасцей Геранім Радзівіл, таксама з'яўляліся своеасаблівым тэатралізаваным відовішчам. Адстрэл звяроў адбываўся ў спецыяльна створаным дэкарацыйным асяроддзі з ужываннем бутафорыі. Пасля палявання ўдзельнікі гэтага «дзікага сармацкага спектакля» запрашаліся на спектакль сапраўдны, але ўжо ў якасці гледачоў. М. Матушэвіч апісаў гэтую з'яву так: «Пасля абеду паехалі мы на паляванне за палавіну мілі ад Слуцка. Было яно асаблівае. Спецыяльна шпалерамі (густа пасаджаныя дрэвы) вызначалі вуліцы, а пасярэдзіне быў шпалер вышынёй у некалькі капцоў, з «вокнамі»; каля таго шпалеру выкапалі роў і напоўнілі яго вадой. Ззаду гэтага шпалеру наганялі дзікіх свіней, якія праз тыя «вокны» ў шпалеры выскоквалі і падалі ў роў, а адтуль выбіраліся на прасторную плошчу, бар'ерамі акружаную. На тых жа дзікіх свінях былі малыя балваны карчмароў у розным адзенні – нібы на конях яны сядзелі. Тады да гэтых свіней паны на ляту стралялі. Былі таксама дзікія качкі са шкла, маляваныя – яны плавалі па каналах, спецыяльна пракапаных; да іх паны таксама стралялі, а тыя падстрэленыя качкі паволі тапіліся» [5, с. 145–146].

Такім чынам, да паратэатральных з'яў на тэрыторыі Беларусі адносілася цэлая група святочных забаў: рыцарскія каруселі, тэатралізаваныя паляванні, пахавальныя цырымоніі і г. д. Гэтыя з'явы паступова набывалі ўсё больш выразны элемент відовішчнасці. Заключаныя ў вобразна-сімвалічную форму, паратэатральныя дзействы ўяўлялі сабой мастацкі твор, яскравае відовішча, якое з'яўлялася важным састаўным элементам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнай гістарычнай падзеі і было магутным сродкам эмацыянальнага і педагагічнага ўздзеяння на грамадзян. Паратэатральнасць у XVII–XVIII стст. стала своеасаблівым жыццёвым асяроддзем, прасякнутым тэатралізаваным этыкетам і бляскам багацця.


1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии 18 в. / Г. И. Барышев. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с. : ил.

2. *Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў / П. А. Гуд. – Мінск : ООО «Мэджик Бук», 2007. – 100 с., іл.

3. *Гусоўскі, М* Песня пра зубра / М. Гусоўскі. – Мінск : Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1994.

4. *Клімуць, Л. Я.* Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с. : іл. – (Серыя «Беларуская гісторыя»).

5. *Котович Т. В.* Карнавал как принцип художественного мышления эпохи барокко на Беларуси / Т. В. Котович // Журнал научных разысканий о биографии, теоретическом наследии и эпохе М. М. Бахтина [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.nevmenandr.net/dkx/?y=1996&n=2&abs=KOTOVICH. – Дата доступа : 04. 09. 2015.

6. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с.

7. *Matuszewicz, M.* Pamietniki Marcina Matuszewicza, kasztelana Brzeskiego-Litewskiego (1714–1765) / M. Matuszewicz. – Warszawa, 1876. T. 1-2, 3-4.

8. O'Connor Bernard, Pamietniki. – Цит. по: Wilinski S. U zrodel portretu staropolskiego, Warszawa, 1958.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***І. М. Цэван,***

*выкладчык кафедры псіхалогіі і педагогікі*


# УМОВЫ ЭФЕКТЫЎНАГА ФАРМІРАВАННЯ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ПАДЛЕТКАЎ У ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАХ

У пачатку XXI ст. у педагагічнай навуцы заўважна абудзіўся інтарэс даследчыкаў да праблемы фарміравання этнакультурных каштоўнасцей асобы. Актыўнае навуковае асэнсаванне феномену «каштоўнасці» характарызуецца наяўнасцю мноства розных падыходаў, навуковых напрамкаў, школ, методык і метадалогій у айчыннай і замежнай навуцы і адначасовай ад-